Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 ЖНІЎНЯ 2016 г. СУБОТА № 150 (28260)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Ад стажора — да прафесара асветы**

СТАР. 6



**Чым здзівіць «Тэарт»?**

СТАР. 8



**Уга Чавес ва ўспамінах беларусаў**

СТАР. 12

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ЧОРНЫ, міністр архітэктуры і будаўніцтва**

*«Запусціць сістэму будаўнічых збераджэнняў няпроста, бо трэба прадугледжваць бюджэтныя сродкі, каб плаціць прэміяльныя тым, хто на доўгія тэрміны будзе рабіць уклады. Цяпер пытанне ў стадыі прапрацоўкі. Каб гэта пачало працаваць, трэба мець больш нізкі працэнт інфляцыі і стаўкі рэфінансавання. Калі мы ідзём на адназначную лічбу інфляцыі, то гэты інструмент рабочы. Пры гэтым падкрэслю, што скарыстацца такім інструментам змогуць не толькі грамадзяне, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9777 | ▼ |
| Еўра | 2,2053 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0302 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0796 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ТУРСКІ ХЛЕБ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Адной з першых у Рагачоўскім раёне завяршае жніво Турская сортавыпрабавальная станцыя (вёска Турск), якая спецыялізуецца на вырошчванні элітных айчынных і замежных сартоў збожжавых культур на насенне. Лепшы ўдзельнік сёлетняга жніва гэтага прадпрыемства — механізатар са шматгадовым стажам Уладзімір САВІЦКІ, а яно — жніво — у яго дваццатае. На камбайне «Палессе 12» майстар хлебаробскай справы са сваім памочнікам Уладзімірам Кавалёвым намалочвае за дзень па 80-100 тон збожжа. У гонар экіпажа на мехдвары гаспадаркі часта паднімаўся сцяг пераможцаў.**

**А малады дырэктар Турскай сортавыпрабавальнай станцыі Аляксандр ХАРЫТОНЕНКА ў час адказнай і гарачай кампаніі ўвогуле заўсёды знаходзіўся на жніўным полі. Хлебаробы станцыі на 450 гектарах сабралі больш як тысячу семсот тон збожжа.**

■ Браты нашы меншыя

## НУМАР «ЛЮКС» ДЛЯ БАРСІКА

### Ці карыстаюцца попытам сталічныя гасцініцы для жывёл?

**Калі гаспадары катоў і сабак збіраюцца ў паездку, у іх заўсёды ўзнікае пытанне: з кім пакінуць гадаванца? Звычайна догляд спрабуюць даручыць суседзям ці сваякам. Больш сучасны варыянт — звярнуцца ў гасцініцу для жывёл. У сталіцы, напрыклад, працуе з дзясятак такіх гатэляў. У якія нумары засяляюць катоў і сабак? Колькі каштуе пражыванне ў гасцініцах? І які хочуць бачыць сэрвіс гаспадары жывёл?**



### 140 рублёў за тыдзень

У гасцінічных нумарах для жывёл няма тэлевізараў і электрачайнікаў. Звычайна гэта невялікія асобныя вальеры з мінімумам мэблі ці без яе. Пастаяльцам абяцаюць двух-трохразовае харчаванне і прагулкі раніцай, днём і ўвечары. Корм просяць прывозіць свой, але па жаданні гатовы прыгатаваць вашаму любімцу нават дамашнюю ежу. Суткі ў гатэлі ў сярэднім каштуюць 20-30 рублёў.

За даплату могуць таксама падстрыгчы вашага гадаванца, арганізаваць дрэсіроўку ці візіт да ветэрынара. Калі не маеце ўласнага аўто і не хочаце дабірацца з катом ці сабакам на грамадскім транспарце, гатэль забяспечыць вас зоатаксі.

СТАР. 5

■ Алімпійскі дзённік

## ПОЗІРК У ГІСТОРЫЮ

### Пра самыя цікавыя факты першых Алімпіяд

**Гульні ў Бразіліі ўжо стартавалі, прайшла ўрачыстая цырымонія адкрыцця, а значыць, алімпійскі агонь запалены і спартсмены гатовыя ўступіць у барацьбу. Спаборніцкая праграма Алімпіяды была адкрыта мужчынскім футбольным турнірам учора і працягнецца ўжо сёння. У суботу самы час «уключацца» ў Гульні і беларускім аматарам спорту, таму што свае выступленні ў Рыа пачынаюць прадстаўнікі нашай краіны.**

СТАР. 4



Першым у складзе беларускай каманды на старт Гульняў выйшаў Антон ПРЫЛЕПАЎ (стральба з лука).